Наталля Зубчонак
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# «Чырвоная змена» праз 90 гадоў. Змест выдання ў кантэкце грамадскіх і агульначалавечых каштоўнасцей

21 красавіка 1921 г. выйшаў першы нумар газеты «Красная смена». Рашэнне аб стварэнні галоўнага камсамольскага выдання было прынята на самым высокім узроўні – на IV з'ездзе КП(б)Б. Сам выхад газеты быў прымеркаваны да 2-га Усебеларускага з'езду КСМБ. Выданне прайшло доўгі шлях. У гэтым годзе споўнілася 90 год з дня заснавання першай маладзёжнай газеты нашай краіны. Якая яна была і якой стала?

«Красная смена» з'явілася ў вельмі складаных сацыяльна-палітычных умовах: краіна актыўна ліквідавала наступствы грамадзянскай вайны, новая эканамічная палітыка (нэп) мела на мэце ў самыя кароткія тэрміны аднавіць прамысловасць, наладзіць сельскую гаспадарку, гандаль, стварыць адпаведныя ўмовы для нармальнай жыццядзейнасці грамадзян. Акрамя таго, у Беларусі актыўна распрацоўвалася нацыянальная палітыка ў адпаведнасці з пастановай X з'езда РКП(б) «Аб задачах партыі ў нацыянальным пытанні». У гэтым напрамку рэдакцыяй «ЧЗ» было зроблена вельмі шмат.

Новае маладзёжнае выданне павінна было стаць актыўным будаўніком сацыялізму. Гэты тэзіс і сапраўды меў глыбокі сэнс: перад моладдзю грамадства ставіла рэальныя задачы, пра вырашэнне якіх павінна была расказваць чытачам новая газета.

Яна выйшла фарматам А3 тыражом у 3 тыс. экз. Паступова тыраж павялічваўся (толькі за 1924 г. ён узрос ад 3,5 тыс. да 10 тыс., у канцы 30-х гг. складаў 35 тыс. экз.).

Аб'ём выдання вагаўся ад чатырох да шасці палос. Напачатку гэта быў штотыднёвік. З 1925 г. газета перайшла на трохразовы выпуск, пачала друкавацца на беларускай мове (з № 18).

Безумоўна, неабходна было ўсебакова асвятляць дзейнасць бальшавіцкай партыі (пазней камуністычнай) і камсамольскіх арганізацый. Так і было. Тым не менш сучаснага чытача ўражвае змястоўная насычанасць і разнастайнасць матэрыялаў, выключная эмацыянальнасць аўтараў, што каласальна павялічвала давер да выдання. Сёння, на жаль, так не пішуць.

Просты дызайн, адсутнасць фотаздымкаў (яны пачынаюць з'яўляцца ў канцы 30-х гг.) ніяк не прыніжаюць значнасці газеты. Сапраўды, для тагачаснага чытача яна была крыніцай інфармацыі ў прамым сэнсе гэтага слова. Не будзем зараз паглыбляцца ў змест, вызначым найважнейшыя напрамкі дзейнасці.

Шмат увагі надавалася навінам з-за мяжы. Вядома, трактавалася такая інфармацыя толькі ў адным накірунку, тым не менш яна была дастаткова разнастайнай. Напрыклад, «Выборы в Германии», «Англия признала советскую республику» (ЧЗ, 1924, № 2) і г. д.

Рэдакцыя газеты пастаянна працавала з творчай моладдзю, рэгулярна выпускала літаратурную старонку, друкавала мастацкія творы, давала парады аўтарам-пачаткоўцам (у рубрыцы «Литературная комса»).

Асобная тэма савецкіх камсамольскіх газет – паказ стваральнай працы чалавека новага грамадства. Газета змяшчала шмат нарысаў, як партрэтных, так і праблемных. Такія публікацыі аказвалі вялікае ўздзеянне на чытачоў.

Шмат сустракалася матэрыялаў, прысвечаных службе ў арміі. Яны былі абумоўлены самім часам: маладую краіну саветаў трэба было абараняць ад знешніх і ўнутраных ворагаў. Паэтызацыя вайсковага жыцця была на самым высокім узроўні.

Адзнака газет савецкага часу – антырэлігійная тэма. Да гэтых матэрыялаў сёння мы ставімся як да перажытку мінулага.

У «ЧЗ» змяшчалася нямала навучальна-асветніцкіх матэрыялаў. У паслярэвалюцыйныя гады ўзровень пісьменнасці насельніцтва краіны быў невысокім і павышаць яго патрэбна было праз сродкі масавай інфармацыі.

Крытыцы і нават сатыры таксама знаходзілася месца ў газеце. «ЧЗ» мела спецыяльныя рубрыкі: «Смех і гумар», «Камсамольская мяцёлка». У фельетонах, сатырычных апавяданнях, анекдотах высмейвалі гультаёў, п’яніц, нядобрасумленных камсамольцаў. Паказальна тое, што называліся канкрэтныя прозвішчы, у такім выпадку пазбегнуць пакарання было проста немагчыма. Уражваюць красамоўныя назвы матэрыялаў: «Шлындаюць без дзела»(ЧЗ, 1925, № 47) і інш.

Добра была наладжана зваротная сувязь. Рэдакцыя мела вялікі штат рабселькараў. Пытанні і адказы друкаваліся ў рубрыцы «Паштовая скрынка».

Фармат артыкула не дазваляе больш падрабязна спыняцца на публікацыях 20 – 30-х гг. (яны будуць прыведзены ў дакладзе). Тым не менш традыцыі, закладзеныя ў той час, пэўным чынам працягваюцца і ў маладзёжнай прэсе. А што сёння змянілася ў падачы матэрыялаў, якія тэмы хвалююць сучасную моладзь?

Больш за 80 гадоў чытачы рэгулярна атрымлівалі «Чырвоную змену». Нават у гады Вялікай Айчыннай вайны знайшліся магчымасці, каб газета для моладзі выходзіла (з 1943 г. выданне «ЧЗ» ажыццяўлялася ў зоне партызанскіх злучэнняў у Любанскім раёне). З 2002 г. перастала існаваць самастойная газета для моладзі «Чырвоная змена». Зараз яна выходзіць як дадатак да «Звязды». Друкуецца нерэгулярна, аб’ём складае каля дзвюх палос фармату А2 (ці А3). Тыраж крыху большы за 33 тыс. экз. (гэта тыраж газеты «Звязда»). Толькі дзякуючы

намаганням калектыву рэдакцыі рэспубліканскай газеты ў наш час удалося захаваць «Чырвоную змену». Хто б мог падумаць, што ў эпоху глабалізацыі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, калі, здавалася б, усё павінна функцыянаваць на самым высокім узроўні, мы не змаглі захаваць самастойнае маладзёжнае беларускамоўнае выданне.

Аналіз сучаснай «ЧЗ» пакідае неадназначнае ўражанне. Газета проста нецікавая. Ёсць адчуванне, што матэрыялы робяцца дзеля нейкага плана ці справаздачы. Калі казаць пра разнастайнасць рубрык, глыбіню ацэнкі з’яў і падзей, то «ЧЗ» савецкіх гадоў яна ўступае поўнасцю. Няма на старонках сучаснай газеты праблемных артыкулаў, няма публіцыстыкі (літаратуры, накіраванай на фарміраванне грамадскай свядомасці). Безумоўна, журналісты асвятляюць пытанні маладзёжнай палітыкі, пішуць пра дзейнасць маладзёжных арганізацый, шмат друкуецца матэрыялаў культурна-асветніцкага накірунку. Усё гэта вельмі карысна, толькі чамусьці не ўспрымаецца чытачамі. Можна дапусціць, што прычына ў тым, якія каштоўнасці сцвярджае сёння маладзёжная прэса і як падаецца інфармацыя.

У дадзеным выпадку аўтарам былі разгледжаны нумары за тры апошнія летнія месяцы. Так, пачалася ўступная кампанія. «“Штурм” прыёмнай камісіі ўжо пачаўся» (толькі самымі папулярнымі застаюцца такія спецыяльнасці, як “эканоміка” і “менеджмент” (Звязда, 2011, 21 ліп.). У інтэрв’ю газеце сакратар прыёмнай камісіі БДАТУ адзначае, што ў іх ВНУ ідуць у асноўным сельскія абітурыенты, а гарадскія выбіраюць эканамічныя спецыяльнасці (Звязда, 2011, 21 ліп.). Чаму журналісты сёння не расказваюць пра іншыя (менш прэстыжныя) прафесіі? Чаму са старонак газеты паступова знікае вобраз чалавека працы? Чаму насаджаецца культ грошай? Журналісты самі гэтаму спрыяюць. Чаму не напісаць, што няма нічога дрэннага ў тым, што нехта працуе на будоўлі ці водзіць аўтобус, расказаць пра лёс гэтага чалавека? Баімся, што не зразумеюць. Не адпавядае часу? Пакуль будзем рэкламаваць толькі самыя высокадаходныя прафесіі, так і будзе.

Вось яшчэ адзін прыклад. Газета дае парады выпускнікам школ, якія не паступілі ў ВНУ, у артыкуле «Змарнаваны год – залішняя раскоша»: «Выпускнікам школ, якія не змогуць стаць студэнтамі ВНУ, варта звярнуць асаблівую ўвагу на магчымасць атрымання рабочых прафесій». І тут жа ўказана, што на рынку вакансій яны складаюць 80 % (Звязда, 2011, 7 ліпеня). Такая інфармацыя можа зацікавіць? А пераканаць? Безумоўна, не. Існуе меркаванне, што дастаткова толькі інфармацыі, а чалавек сам вырашыць, як яе выкарыстаць. Гэта не зусім правільна, асабліва ў адносінах да маладзёжных выданняў. Многае патрабуе тлумачэння, а гэтага сёння няма.

Увогуле, зараз тэма адносін чалавека да працы займае асобнае месца як у нашым жыцці, так і ў СМІ. Вось яшчэ прыклад. З артыкула «ЧЗ»: «Праца не воўк, у лес не ўцячэ – абвяшчае народная мудрасць. Пэўная частка праўды ў гэтым ёсць. Аднак цяпер, каб

уладкавацца на працу, іншы раз трэба за ёй і пабегаць» («Панацэя для беспрацоўных: як набыць новую спецыяльнасць за 4 месяцы»; Звязда, 2011, 7 ліпеня). Сапраўды, знайсці працу цяжка, дык, можа, лепш і не працаваць? Многія так і робяць. Ці яшчэ: у матэрыяле «Жыццё студэнта вачыма абітурыента» (Звязда, 2011, 3 жн.) аўтар адзначае перавагі студэнцкага жыцця: вельмі цікава, няма бацькоўскай апекі, адчуваеш сябе дарослым, можна рабіць што хочаш. А вучыцца цяжка. Шмат інфармацыі... А вось красамоўны загаловак: «Выпускнікі, якія не хочуць працаваць па размеркаванні, заплацяць кампенсацыю» (Звязда, 2011, 7 ліп.). А чаму не хочуць? Ніхто не цікавіцца.

Безыдэйнасць матэрыялаў сучасных СМІ вельмі насцярожвае. Праз газетныя публікацыі, тэле-, радыёперадачы мы сцвярджаем каштоўнасці, выхоўваем новае пакаленне. А якім яно будзе, калі чытаем у большасці матэрыялы кшталту: «Патанчым пад рэтра» (Звязда, 2011, 1 вер.)., «У пошуку прыгод» (Звязда, 2011, 7 ліп.), «Сам сабе рэжысёр» (Звязда, 2011, 3 жн.), «Па брэнды ў сэканд-хэнды» (Звязда, 2011, 7 ліп.), і г. д. Усё пра тое, як цікава правесці вольны час, адпачыць. А працаваць калі?

Бясспрэчна, калі ёсць такое жаданне, то калі ласка. Летнія выпускі «ЧЗ» друкавалі матэрыялы пра дзейнасць БРСМ, у прыватнасці аб працы ў будаўнічых атрадах: «Алімпійскі аб’ект рукамі беларускіх студэнтаў» (Звязда, 2011, 17 жн.), «У саюз з сябрамі» (Звязда, 2011, 3 жн.). Аднак гэта толькі невялікая кропля ў моры проста інфармацыі.

Тут можна паспрачацца, сказаўшы, што зараз попыт менавіта на такія матэрыялы. Гэта пазнавальна. Але, з другога боку, да чаго ў будучым мы прыйдзем? Адказ просты: да поўнай бездухоўнасці, абыякавасці (калі ўжо не прыйшлі).

Сапраўды, друкаваная журналістыка сёння перажывае крызіс. І, як паказвае жыццё, не толькі эканамічны. Не толькі пад уплывам найноўшых камунікацыйных тэхналогій змяніліся прынцыпы дзейнасці СМІ. Мы ў многім адмовіліся ад традыцый, адкінулі вопыт папярэднікаў, упарта не жадаем прызнаваць, што нехта мог зрабіць лепш.

Сёння ніхто не заклікае адраджаць сацыялістычныя ідэі, насаджаць культ асобы, даносіць на сваіх сяброў праз газету. Але хочацца, каб выданне было сапраўдным дарадцам ускладаных жыццёвых пытаннях, каб знакамітыя беларускія газеты, якія маюць такі багаты вопыт і гісторыю, не знікалі, а працягвалі па-сапраўднаму выхоўваць новыя пакаленні моладзі.